# *ЭКСПАЗІЦЫІ МУЗЕЯ “СЛАВА НАСТАЎНІКУ. ЗАЛА ПАМЯЦІ У.С.КАРАТКЕВІЧА”*

## Зала памяці У. С. Караткевіча

### <u>Дзіцячыя гады У.С. Караткевіча</u>

Экспазіцыя распавядае пра дзіцячыя гады У.С.Караткевіча. Тут змешчаны цікавыя і рэдкія фотаздымкі з сямейнага альбома Караткевічаў, лісты і малюнкі маленькага Валодзі. Унікальнымі можна лічыць фотаздымкі, на якіх можна пазнаць любімую настаўніцу Караткевіча -- Грыневіч Кацярыну Іванаўну.

### <u>Студэнцкія гады У.С. Караткевіча</u>

У экспазіцыі прадстаўлены фотаздымкі студэнцкіх гадоў У.С.Караткевіча, копіі дакументаў, характарыстыка пасля заканчэння Кіеўскага ўніверсітэта, фота Караткевіча з настаўнікамі СШ №8.

Частка экспазіцыі прысвечана літаратурнай дзейнасці У.С.Караткевіча. Тут прадстаўлены кнігі з асабістай бібліятэкі пісьменніка, кнігі У.С.Караткевіча з аўтографам Н.С.Кучкоўскай, пераклады кніг на іншыя мовы. Асаблівую цікавасць уяўляюць рукапісныя творы аўтара, уласныя малюнкі да твораў, партрэтныя замалёўкі, сяброўскія шаржы, выкананыя рукой У.С. Караткевіча. У экспазіцыі таксама прадстаўлены афішы да спектакляў па творах У.С. Караткевіча з аўтографамі акцёраў, а таксама фотоздымкі п’ес.

### <u>Падарожжы У.С. Караткевіча</u>

Частка экспазіцыі “Зямля пад белымі крыламі” прысвечана падарожжам Караткевіча па Палессі. Тут змешчана шмат фотаздымкаў, зробленых фотокарэспандэнтам Валянцінам Ждановічам, сябрам Караткевіча, з якім разам вандравалі па Беларусі.

Другая частка экспазіцыі расказвае пра апошнія гады жыцця У.С. Караткевіча.

Большасць экспанатаў у музеі з’явілася дзякуючы сястры Караткевіча Наталлі Сяменаўны Кучкоўскай. Яна шмат зрабіла па захаванні хатняга архіва і літаратурнай спадчыны пісьменніка.

**Зала “Слава настаўніку”**

**Гісторыя адукацыі на Аршаншчыне ў XVI-XIX стагоддзях**

У экспазіцыі пададзена інфармацыя аб першых навучальных установах, якія былі адкрыты ў горадзе Орша яшчэ ў 16 стагоддзі, першых настаўніках, якія пакінулі пасля сябе след у гісторыі горада і краіны. На стэндах-фотаздымкі і інфармацыя пра такіх вядомых асоб, як Спірыдон Собаль, Іван Насовіч, Панцеляймон Лепяшынскі. У цэнтры экспазіцыі-- дыярама па карціне М. Багданава-Бельскага “Каля дзвярэй школы”.

**Станаўленне савецкай школы ў 1917-1941 гадах**

На стэндзе прадстаўлены фотаздымкі, дакументы, у якіх распавядаецца аб стварэнні школ у горадзе Орша, а таксама школ для дарослых (па ліквідацыі непісьменнасці), пазней – адкрыцці Аршанскага педагагічнага вучылішча. Вялікая ўвага адводзіцца біяграфіі лепшых прадстаўнікоў новай, рабоча-сялянскай інтэлігенцыі. У экспазіцыі можна ўбачыць пісьмовыя прыборы вучняў: чарніліцы, пёравыя ручкі, наглядныя дапаможнікі.

**Экспазіцыя " На абароне Радзімы»**

З драматычнымі падзеямі Вялікай Айчыннай знаёмяць раздзелы экспазіцыі: “Настаўнікі ў гады Вялікай Айчыннай вайны” і “Саша Котаў –герой Вялікай Айчыннай вайны, вучань школы".

У першым раздзеле экспазіцыі прадстаўлены матэрыялы пра настаўнікаў Аршаншчыны, што ваявалі на фронце, былі ў партызанах, удзельнічалі ў падполлі. Сярод іх Шкрэдаў Акім Радзіновіч – былы дырэктар школы №3. Зведаў жахі фашысцкіх канцлагераў у горадзе Славута на Украіне, Бухенвальд у Германіі. У экспазіцыі прадстаўлены асабістыя рэчы Акіма Радзівонавіча, якія былі перададзены яго сваякамі. Самая драматычная калекцыя-прадметы з канцлагера-лыжка і рэшткі адзення.

Другі раздзел экспазіцыі прысвечаны былому вучню СШ № 3, удзельніку вайны, Аляксандру Котаву. У экспазіцыі музея можна ўбачыць дакументы, лісты, фотаздымкі, асабістыя рэчы Сашы (вазачка, компас,

гадзіннік). Захавалася перапіска юных следапытаў школы з экіпажам цеплахода «Саша Котаў», які быў пабудаваны ў Германіі ў 1972 годзе.

Заслугоўваюць увагі прадметы, якія падарылі музею самі ветэраны (макет зенітнай гарматы, які перадаў Абезгауз Я. Я. на сустрэчы з вучнямі) Удалым рашэннем усёй экспазіцыі з'яўляецца тое, што яе дапаўняюць фатаздымкі і прадметы, якія нагадваюць пра генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**<u>Настаўнікі-наватары</u>**

Педагогі-наватары-- настаўнікі, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё сучаснай адукацыі. У экспазіцыі прадстаўлены фотаздымкі вядучых педагогаў Аршаншчыны (Галіны і Сяргея Трафімавых, Валерыя Герасімава, Марыі Дзмітранок і інш.), інфармацыя аб іх жыцці і педагагічнай дзейнасці. Таксама ў экспазіцыі прадстаўлены асабістыя рэчы, рукапісныя работы, кнігі настаўнікаў.

**<u>Летапіс сярэдняй школы №3 г.Оршы</u>**

Экспазіцыя распавядае пра гісторыю школы, яе станаўленне і развіццё, знаёміць з былымі педагогамі і выпускнікамі. Школа выпусціла ў жыццё шмат годных сваіх вучняў. Сярод іх вядомы беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч.

Адна са старонак летапісу знаёміць нас з выпускнікамі школы, воінамі-інтэрнацыяналістамі, якія загінулі ў Афганістане. На стэндзе прадстаўлены фотаздымкі і дакументы з асабістага архіва сваякоў. Яшчэ адна частка экспазіцыі прысвечана стваральніку і кіраўніку школьнага музея Радомскай Ліліі Дзмітрыеўне.